# СЛОВА, АДЗІНСТВА, НАТХНЕННЕ

**10 кастрычніка 2024 года ў Гродзенскім дзяржаўным каледжы бытавога абслугоўвання насельніцтва адбылася тэматычная грамадска-літаратурная акцыя «Слова яднання». Мерапрыемства сумясціла ў сабе фарматы літаратурнай гасцёўні і адкрытага дыялогу.**

Творчыя дэсанты Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ў гэтай навучальнай установе даўно сталі традыцыяй. Можна без перабольшання сказаць, што гродзенскія пісьменнікі і каледж бытавікоў звязаны моцнымі вузамі сяброўства. Нас і нашы творы тут ведаюць і заўсёды рады асабістай сустрэчы.



Чарговае мерапрыемства, грамадска-літаратурную акцыю «Слова яднання» гродзенскія літаратары прысвяцілі 85-годдзю ўз'яднання беларускіх зямель і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гаспадыня, бібліятэкар каледжа Таццяна Яўгенаўна Хут спецыяльна да акцыі падрыхтавала змястоўную выставу публікацый на тэму Дня народнага адзінства, самага маладога свята Беларускай дзяржавы.

Маладосць – пара, калі многае адбываецца ўпершыню, калі фармуецца асоба, калі ў яе закладваюцца асновы гарманічнага існавання ў свеце людзей. Таму

кантакты з моладдзю надзвычай важныя для сучаснага літаратара. Так, сёння мы сустракаемся з падлеткамі, маладымі людзьмі, чый жыццёвы шлях толькі пачынаецца, але ўжо заўтра ім наканавана ацэньваць нашу культурную спадчыну, вырашаць лёс айчыннага мастацтва. Калі вы не вядзеце гэты дыялог пакаленняў, не ідзяце на сустрэчу да моладзі, то як творчая адзінка рэалізуецеся толькі на палову, будучыня ваша нявызначаная. Менавіта таму праца з моладдзю значыцца сярод прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, праца шматпланавая – творчая, грамадска-адукацыйная, асветніцкая. Удзельнікамі тэматычнай грамадска-літаратурнай акцыі «Слова яднання» сталі: старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Людміла Кебіч; члены СПБ, паэтэса Кацярына Каламійцава; паэтэса Людміла Шаўчэнка і паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Аўдыторыю пісьменнікам склалі навучэнцы адразу некалькіх груп 2-га курса (спецыяльнасці мастак-мадэльер, майстар вытворчага навучання, цырульнік, майстар па манікюры).



**Сярод удзельнікаў акцыі ветэран педагагічнай працы, грамадскі актывіст Л. Л. Хацько**

Эпіграфам да мерапрыемства паслужылі словы з верша Людмілы Кебіч: «Праз гады выпрабаванняў – да сяброўства і яднання...». Людміла Антонаўна расказала прысутным пра дзейнасць абласной пісьменніцкай арганізацыі, а таксама паразважала пра ідэі адзінства і згоды ў жыцці кожнага беларуса, пра

тое, якую страшную, крывавую цану заплацілі нашы слаўныя продкі за нашу магчымасць жыць і працаваць пад мірным небам, у адзінай, незалежнай і мірнай краіне. А 17 верасня 1939 года гісторыя Беларусі пачала свой новы адлік. Наш літаратурны лідар прадэкламавала ўласныя вершы, прысвечаныя Дню народнага адзінства і заходнебеларускім паэтам-барацьбітам за народнае ўз'яднанне Міхасю Васільку і Валянціну Таўлаю. …Людміла Шаўчэнка вельмі шмат піша на тэмы вайны і гераічнага подзвігу народа-пераможцы фашызму. Літаральна кожны з прачытаных падчас акцыі твораў паэтэсы можна назваць рэквіемам па шматлікіх ахвярах і гімнам перамозе над сіламі цемры. …Кацярына Каламійцава з патрыятычнай і філасофскай лірыкай не толькі як паэтэса, але і як маці трох сыноў прысвяціла сваё выступленне катэгорыі «дзеці вайны». Пранікнёным маніфестам народнага адзінства і веры ў лепшае прагучалі радкі яе верша «Сила колыбельной». …Паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык уключыў у сваё выступленне верш на тэму ўз'яднання беларускага народа і нарыс пра свайго дзеда-франтавіка, удзельніка стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён», вынікам якой стала поўнае вызваленне беларускай зямлі ад фашысцкай акупацыі. У акцыі «Слова яднання» таксама ўзяла ўдзел ветэран педагагічнай працы, грамадскі актывіст Ларыса Лук'янаўна Хацько. Па традыцыі пісьменнікі правялі аўтограф-сесіі і падарылі свае кнігі бібліятэцы каледжа.



Жыццё дэманструе нам, што супакойвацца нельга. Дарослым неабходна мацаваць грамадскае адзінства, добрасумленна працягваць традыцыі мірнай, стваральнай працы, а моладзі – берагчы неакрэплыя душы ад заражэння шкоднымі ідэямі. Тым больш, што фашызм зноў падымае галаву. Выратавацца, ацаліцца можна толькі актыўнасцю сапраўднага грамадзяніна-патрыёта і творчым ладам жыцця. Галоўная ідэя тэматычнай акцыі ГрАА СПБ «Слова аднання» – у неабходнасці кожнаму з нас усведамляць усё гэта. Гродзенскі дзяржаўны каледж бытавога абслугоўвання насельніцтва жыве цікавым, багатым на падзеі жыццём. Кожны дзень тут дае будучым прафесіяналам, маладым грамадзянам Беларусі каштоўныя вопыт і веды. Не выклікае сумненняў, што і праведзенае ў бібліятэцы тэматычнае літаратурнае мерапрыемства ў юных душах пакінула свой след. А сродкам яднання і натхнення стала мастацкае слова. Слова, што ідзе ад сэрца.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас грамадска-літаратурнай акцыі ГрАА СПБ «Слова яднання», прысвечанай 85-годдзю ўз’яднання беларускіх зямель і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Бібліятэка ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны каледж бытавога абслугоўвання насельніцтва», 10 кастрычніка 2024 года.



Людміла Кебіч



Дзмітрый Радзівончык



Кацярына Каламійцава



Людміла Шаўчэнка







У фінале акцыі – традыцыйная аўтограф-сесія






Удзельнікі грамадска-літаратурнай акцыі «Слова яднання» падарылі свае кнігі бібліятэцы каледжа




Агульнае фота на памяць







**Фота**
Таццяны Хут
і Дзмітрыя Радзівончыка

**Спасылка** на сайт каледжа: https://ggkbon.by/o-kolledzhe/novosti